# ЯЕ ВЯЛІКАСЦЬ ГІСТОРЫЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Соф'я Гальшанская ў гэтым мястэчку — не проста каларытны гістарычны персанаж. Яна заснавальніца дынастыі Ягелонаў, якая бярэ тут пачатак і стала родам славутых польскіх каралёў. У самым цэнтры Гальшан (калі можна лічыць цэнтрам штосьці акрамя замка) на плошчы стаіць памятны валун з высечаным партрэтам князёўны і словамі, прысвечанымі ёй. Вядучыя, апранутыя ў гістарычныя строі, размаўлялі з прысутнымі, у той час як натоўп на плошчы ўсё прыбываўся і прыбываўся. Урэшце зайграла прыгожая музыка — гучалі толькі скрыпкі — а на плошчу выйшаў тэатр гістарычнага танца 1410. Адзін малады чалавек, адзеты ў касцюм блазна (да таго ж босы) і некалькі панянак ды юнак затанчылі, пабраўшыся парамі. Вядучыя ўсклалі да помніка Соф'і па два жоўтыя цюльпаны.



Тым часам рыцарскія шэрагі каля плошчы таксама ўсё гусцелі і гусцелі. І, калі сцішылася вясёлая музыка, яны пакрочылі ва ўрачыстым шэсці ў свой невялічкі паход — да сцен замка.

Першай ішла конніца з клуба «Залатая шпора»: мужныя рыцары ў прыгожых даспехах упэўнена трымаліся на здаровых і дужых конях. Следам крочылі пешыя вояры з іншага клуба гістарычнай рэканструкцыі. Далей ішлі лучнікі, следам за імі — манахі. Самыя розныя эпохі, розныя ўзбраенне і адзенне былі прадстаўленыя ў гэтых шэрагах. Бліжэй да канца калоны шыбавалі ўдзельнікі клуба «Шатландская пяхота» з Маладзечна — у клятчастых спадніцах, скураных куртках, зграбных капялюшыках — надзвычай каларытныя асобы!

Цэнтральная вуліца Гальшан — выдатны прыклад традыцыйнага беларускага мястэчка. У свой час тут жыло даволі шмат яўрэяў, пра што сведчыць і традыцыйная архітэктура. Абапал дарогі ідуць як каларытныя мураваныя двухпавярховікі, так і невялічкія драўляныя дамкі.

Мясцовы жыхар Пётр Казлоўскі ў час свята вырашыў папрацаваць фурманам. Свайго ўласнага каня ён запрог у брычку — а на ёй катаў і турыстаў, і цікаўных журналістаў. Ужо ў хуткім часе свой невялічкі бізнес і карэту мужчына плануе ўдасканаліць. Ён дамовіўся з майстрам, які абшые фурманку дрэвам, прыдумае яе дызайн. Тады можна будзе разлічваць на большы попыт, мяркуе мясцовы жыхар. «І машыне, і каню патрэбны догляд», — разважае Пётр Казлоўскі. І выбірае застацца верным свайму даўняму падкаванаму сябру.

Перад уваходам у замак размясціліся рамесніцкія рады. Усе прадстаўленыя тут тавары зроблены з душой, сваімі рукамі. Было шмат ганчароў з керамічнымі вырабамі, у тым ліку з Івянца Валожынскага раёна. Адразу некалькі жанчын прынеслі паясы, тканыя на бердзечку. Можна было павучыцца рабіць пісанкі (на яйках), а таксама прымерыць шыкоўныя саламяныя кароны.

Дарэчы будзе згадаць і словы з народнай песні «А без дудкі, без дуды, хо-дзяць ногі не туды» — бо дуда тут гучала ўвесь час. І ногі самі сабою ішлі ў скокі. Танцавалі ўсе — і вядомую многім маразулю, і больш рэдкія танцы, якія, аднак, умела паказаныя вядучымі, было нескладана паўтарыць.

У наступныя гады на фестываль можна будзе дадаць традыцыйную ежу. Бо з таго, чым можна было пачаставацца сёлета, вылучаюцца хіба што юшка і пернічкі, спечаныя на мясцовым хлебазаводзе, а таксама прыезджай майстрыхай. Думаецца, было б цікава, каб мясцовыя жыхары падрыхтаваліся і прапанавалі (натуральна ж, за грошы) тыя стравы, рэцэпты якіх яны атрымалі яшчэ ад сваіх бабуль і дзядуляў. Было б хораша, каб мясцовыя па прыкладзе Пятра Казлоўскага далучыліся да фестывальнага жыцця.





* * *

Сёлетні фестываль «Гальшанскі замак» атрымаўся надзвычай цэласным. Дзейства, якое пачалося ў цэнтры горада, паступова перамясцілася да замка, а пасля плаўна, без заўважных перапынкаў, перацякала з адной пляцоўкі на іншую. Праграма ўвесь час была насычанай — можна было і здзіўляцца, і захапляцца, і проста атрымліваць асалоду. Са сцэн не прагучала ніводнага афіцыйнага каментарыя — хоць гаспадары, прадстаўнікі ўлады былі сярод прысутных. І гэта таксама слушна — ад-даць увесь святочны час у распараджэнне рэканструктараў, музыкаў і яе вялікасці гісторыі.

Дзесяць гадоў таму «Гальшанскі замак» прыдумалі ў гурце «Стары Ольса» (на дзесяцігоддзе самога гурта) як першы анімацыйны фестываль. З таго часу гэтыя музыкі з'яўляюцца заўсёднікамі фестывалю. Можна было пачуць іх і сёлета (як і не менш каларытны гурт сярэднявечнай музыкі «Літы талер») — і нават дзеля гэтага аднаго можна было спецыяльна завітаць у Гальшаны.

У тым, што фестываль будзе працягвацца, няма ніякіх сумненняў. А нам усім хочацца пажадаць яшчэ больш такіх свят, цёплых, сапраўдных, з прадстаўленнем усяго таго найлепшага, што мы мелі — і не страцілі.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**
*Ашмянскі раён.*

Шануй сваё!

# ВІНТАЖНЫ РОЛС-РОЙС І АРХІТЭКТУРА ЛАНГБАРДА

**«Звязда» не так даўно пісала пра брытанскага архітэктара Цзыўая Со, які спраектаваў Беларускую мемарыяльную капліцу ў Лондане, і пра тое, што яна была прызнана адным з найпрыгажэйшых будынкаў Еўропы. А зусім нядаўна стала вядома, што архітэктар узяўся за новы праект, таксама натхнёны нашай краінай. Ён прыдумаў новы павільён для найстарэйшага ў свеце дылера і рэстаўратара вінтажных аўтамабіляў «Ролс-Ройс» і «Бэнтлі». Будынак новага галаўнога офіса кампаніі размесціцца ў Сюрэі (Вялікабрытанія). Збудаванне ўзвядуць у індустрыяльным раёне, які ўзнік у 1920-х гадах. І на тое, які яно будзе мець выгляд, Цзыўая Со натхніла архітэктура Іосіфа Лангбарда 1920-х гадоў, якую ён убачыў (занатаваў, замаляваў) у Мінску.**



Фота Сашы БЕЛАВОКАЙ.

— Я быў у добрым сэнсе ўражаны канструктывісцкімі будынкамі, якія бачыў у Беларусі, — расказаў Цзыўай Со нашаму карэспандэнту. — Архітэктуру гэтага стылю (натхнёную супрэматызмам) доўгі час адносілі да спадчыны заходняй мадэрнісцкай школы. Канструктывісцкі і супрэматычны рух разгледзілі як найбольш інтэнсіўныя і ўплывовыя ў архітэктуры XX стагоддзя. Беларусь адыграла важную ролю ў развіцці гэтай ідэі. Віцебск быў эпіцэнтрам, у якім развіваўся авангардызм таго часу, гэты працэс моцна звязаны з такімі гігантамі, як Казімір Малевіч і Эль Лісіцкі.

Новы будынак у Сюрэі спраектаваны такім чынам, каб наведвальнікі маглі бачыць, як рэстаўруюцца вінтажныя аўтамабілі. Госці павільёна будуць перамяшчацца з шоўрума на першым паверсе цераз асобны мост на верхнім паверсе да абліцаваных празрыстым полікарбанатам памяшканняў аўтамайстэрань, дзе змогуць убачыць увесь працэс рэстаўрацыі.

Дызайн аўтамабільнага павільёна з выпуклым закругленым кутом быў натхнёны старым будынкам нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску, а таксама старой фабрыкай-кухняй у беларускай сталіцы — дзвюма пабудовамі ў стылі канструктывізму.

І гэта яшчэ не ўсе праекты, звязаныя з Беларуссю, якімі на дадзены момант займаецца брытанскі архітэктар. У каледжы Вулфсан Кембрыджскага ўніверсітэта 2 ліпеня адкрываецца яго персанальная выстаўка (будзе працаваць да 22 верасня). На ёй будуць прадэманстраваны многія малюнкі архітэктара, якія ён зрабіў, калі быў у Беларусі, а таксама яго праекты, якія ўжо атрымалі шматлікія ўзнагароды. Арыгінал малюнка вялікага памеру «Слонім, 1941», натхнёны візітамі гэтага творцы ў Беларусь і асабістымі ўспамінамі сям'і Каплінскіх, будзе прадстаўлены публіцы ўпершыню. Матэрыялы і тэмы, звязаныя з Беларуссю, складуць значную частку гэтай важнай экспазіцыі ў прэстыжным каледжы і сусветна вядомым універсітэце. Некаторыя працы пасля завяршэння выстаўкі будуць перададзеныя ў пастаянную калекцыю музея Вікторыі і Альберта.

— Выстаўка прадставіць абрания малюнкі і чарцяжы, зробленыя мной ад больш ранніх часоў да сённяшняга дня, — расказвае архітэктар. — Праз гэтыя працы можна прасачыць вытокі маіх ідэй — ад самых першых да больш позніх. Я прэзентую і свае больш вядомыя праекты, такія як Беларуская мемарыяльная капліца ў Лондане, а таксама пан-Еўрапейскі мемарыял ахвярам таталітарызму XX стагоддзя ў Бруселі, яшчэ праект вінтажнай аўтамабільнай галерэі і працу для Fank Dale & stepsons і іншыя праекты. Каля 40 працэнтаў прац на выстаўцы маюць адносіны да Беларусі, таксама я ўпершыню пакажу публіцы мае малюнкі, натхнёныя візітамі ў Слонім і асабістымі ўспамінамі пра сям'ю Каплінскіх. Маё сяброўства з імі пачалося з таго, што Сямён Каплінскі (дзядзька Наташы Каплінскай) аднойчы наведаў Беларускую царкву ў Лондане і вельмі ўпадабаў яе — з гэтага пачалося добрае сяброўства.

Цзыўай Со таксама працуе над праектам рэстаўрацыі сінагогі ў Слоніме. Ён заклікае беларускіх архітэктараў далучацца да працы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

**Праект павільёна для вінтажных аўтамабіляў натхнёны беларускай архітэктурай Іосіфа Лангбарда.**

